Источник: "Belarus" - №8, 2024-08-22



# НЕВЫЧАРПАЛЬНАЯ ТЭМА

## Новыя падыходы ў вывучэнні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

**Больш за 400 чалавек узялі ўдзел ў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: гісторыя і сучаснасць». Арганізатарамі форуму выступілі Нацыянальная акадэмія навук Беларусі сумесна з міністэрствамі абароны і адукацыі, а таксама грамадскімі арганізацыямі. Канферэнцыя праводзілася ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў “Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы” і была прымеркавана да 80-годдзя вызвалення Беларусі.**

Разам з вучонымі і архівістамі на канферэнцыі выступалі прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, генеральнай пракуратуры, краязнаўцы, работнікі музеяў, бібліятэк, ВНУ. Даследчыкі прыехалі з розных куткоў Беларусі, а таксама з Расіі, Таджыкістана і Узбекістана.

Прагучала больш за сотню дакладаў і прэзентацый, якія датычыліся не толькі ваеннай гісторыі, але і пытанняў захавання памяці, супрацьдзеяння фальсіфікацыі, патрыятычнага выхавання, раскрывалі тэму з розных бакоў. Напрыклад, падчас работы секцыі “Падзеі Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннай эпохі. Гісторыя на старонках школьных падручнікаў” даследчыкі гаварылі пра абаронцаў Брэсцкай крэпасці і Полацка, пра тое, якую ролю мелі ў гады вайны словы Якуба Коласа. У гэты час іх калегі на суседніх секцыях выступалі з дакладамі пра акупацыйны рэжым, ролю партызанаў, ваенную сацыру, пра населеныя пункты, якія адзначаны вымпеламі “За мужнасць і трываласць у гады Вялікай Айчыннай вайны”. Такі знак быў прыняты загадам Прэзідэнта ў 2004 годзе. Да 80-годдзя вызвалення Беларусі падобным чынам былі адзначаны дзевяць населеных пунктаў, усяго ж іх ужо 36.

Прадстаўнікі Татарстана і Таджыкістана гаварылі пра тое, наколькі важна аб’ядноўваць намаганні вучоных розных краін у вывучэнні пытанняў, звязаных з ваеннай гісторыяй.

“Канферэнцыя не толькі носіць навукова-пазнавальны характар, яна перш за ўсё служыць аднаўленню і ўмацаванню гістарычнай памяці ўсіх народаў, якія рабілі ўнёсак у вызваленне Беларусі”, — заўважыў галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі, археалогіі і этнаграфіі Нацыянальнай акадэміі навук Таджыкістана Фазіл Абдурашытаў.

### Яны змагаліся за Беларусь

Дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вадзім Лакіза падкрэсліў, што сёння дзяржавай робіцца вялікая праца па захаванні гістарычнай памяці, і перад даследчыкамі стаіць сур’ёзная задача комплексна падыходзіць да вывучэння пытанняў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, захаваннем праўды, супрацьстаяннем фальсіфікацыі гістарычных фактаў.

Даследчыкі шмат гаварылі пра стратэгічную наступальную аперацыю “Баграціён”. У прыватнасці, ёй быў прысвечаны даклад старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра Гусакова, які прагучаў на пленарным пасяджэнні. У ходзе аперацыі была цалкам вызвалена тэрыторыя Беларусі, частка Прыбалтыкі, усходняя частка Польшчы. Практычна цалкам была разгромлена нямецкая група арміі Цэнтр. Наступленне Чырвонай Арміі праходзіла пры дапамозе партызан, падпольшчыкаў і ўсяго насельніцтва. У дакладзе было падкрэслена, што значны ўклад у разгром і выгнанне германскіх агрэсараў з Беларусі ўнеслі воіны ўсіх рэспублік Савецкага Саюза: “За подзвігі, здзейсненыя падчас аперацыі “Баграціён” Героямі Савецкага Саюза сталі камандзір танкавага ўзвода азербайджанец Наджаўкулі Рафіеў, камандзір стралковага ўзвода армянін Газарас Авакян, намеснік камандзіра авіяцыйнай эскадрыллі грузін Георгій Інасырыдзе, камсарг батальёна казах Ізгуты Айтыкаў, кулямётчык, яфрэйтар кіргіз Джумаш Асаналіеў, кулямётчык, яфрэйтар малдаванін Сяргей Балгарын, камандзір гарматы таджык Сафар Аміршоеў, камандзір эскадрона, старшы лейтэнант туркмен Мулькі Байрамаў, камандзір роты ўзбек Гулям Акубаў”. Разам з савецкімі авіяцыйнымі часцямі ў складзе першай паветранай арміі змагаліся французскія лётчыкі Першага знішчальнага авіяпалка “Нармандыя”. За мужнасць і гераізм, праяўленыя імі пры вызваленні Беларусі на рацэ Нёман палку было прысвоена званне “Нармандыя-Нёман”. Чатыры французскія лётчыкі сталі Героямі Савецкага Саюза. Першымі пачалі вы-



Яўген Кручкоў. Невычарпальная тэма

Источник: "Belarus" - №8, 2024-08-22



зваленне Мінска 3 ліпеня 44 года танкісты Другога гвардзейскага танкісцкага корпусу пад камандаваннем украінца генерала Бурдзейнага. Менавіта Аляксей Сямёнавіч Бурдзейны, ганаровы грамадзянін Мінска, запаліў Вечны агонь 3 ліпеня 1961 года ў падножжа помніка Перамогі.

Вызваленне Беларусі сведчыць пра шматлікія прыклады гераізму, стойкасці, высокага воінскага майстэрства і самаахвярнасці. Толькі ў ліпені-жніўні 1944 года 402 тысячы чалавек з колькасці радавога і каманднага саставу чатырох франтоў былі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі. За праяўленую ў ходзе аперацыі “Баграціён” мужнасць сотні злучэнняў і часцей розных радоў войск атрымалі ганаровае званне гарадоў, пры вызваленні, якіх яны вызначыліся. Мінскімі сталі 58 воінскіх фарміраванняў, Брэсцкімі — 47, Віцебскімі — 62, Аршанскімі — 41, Полацкімі — 21, Баранавічскімі — 28, Магілёўскімі –21, Бабруйскімі — 20 і Гродзенскімі –17.

Прывітанне ўдзельнікам форуму даслаў дырэктар Інстытута партызанскай гісторыі Расійскай акадэміі навук Юрый Пятроў: “Час вайны адыходзіць усё далей, але наша гістарычная памяць цэментуецца агульнымі трагедыямі, подзвігамі, безумоўна, да іх адносіцца і аперацыя “Баграціён”. Яна па праве лічыцца адной з буйнейшых ваенных аперацый у гісторыі чалавецтва. З абодвух бакоў у ёй удзельнічалі больш чатырох мільёнаў чалавек. Страты, якія панесла Германія ў ходзе гэтага змагання, беспрэцэдэнтныя. Ніколі раней Германія не страчвала адразу паўмільёна салдат. Гэта сведчыла, што пераломны момант наступіў”. Ён заўважыў, што ў Інстытуце расійскай гісторыі сумесна з вучонымі Інстытута гісторыі Беларусі сёлета была праведзена канферэнцыя, прысвечаная гэтым ваенным падзеям, там прагучала ідэя падрыхтаваць вялікую сумесную работу. “Настаў час аб’яднаць нашы намаганні, абагуліць тое, што мы ведаем па гісторыі гэтага вялікага змагання”,— упэўнены Юрый Пятроў.

## Пяты фронт

Неацэнную дапамогу ў летнім наступленні франтам Чырвонай Арміі аказалі партызаны і падпольшчыкі. Да гэтага часу на тэрыторыі Беларусі дзейнічала каля 270 тысяч партызанскіх злучэнняў, 144 брыгады і 49 асобных атрадаў. Яшчэ напярэдадні генеральнага наступлення савецкіх войск народныя мсціўцы ўначы на 20 чэрвеня нанеслі масіраваны ўдар па асноўных чыгуначных магістралях. У “рэйкавай” вайне, якая разгарнулася ў ходзе аперацыі “Баграціён”, былі цалкам выведзены са строю найбольш важныя чыгуначныя шляхі, часткова паралізаваны перавозкі ворага па ўсіх дарогах. Партызаны не толькі наносілі ўрон па варожых камунікацыях, але і трымалі для савецкіх войск масты, пераправы, плацдармы, не дапускалі грабяжу і знішчэння вёсак, ратавалі мірных жыхароў. Народныя мсціўцы сваімі сіламі і ва ўзаемадзеянні з часцямі Чырвонай Арміі вызвалілі ад акупантаў два абласных і больш 40 раённых цэнтраў рэспублікі.

У гонар вызвалення сталіцы БССР 16 ліпеня 1944 года ў Мінску прайшоў урачысты мітынг працоў-

Алена Дзядзюля




■ Аперацыя “Баграціён” лічыцца адной з буйнейшых ваенных аперацый

ных і партызан з удзелам дэлегацыі Чырвонай Арміі. У парадзе, які адбыўся пасля яго, удзельнічала больш 20 тысяч партызан Мінскага, Магілёўскага, Вілейскага і Баранавіцкага злучэнняў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага савета СССР ад 15 жніўня 1944 года за ўзорнае выкананне ўрадавых заданняў у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у тыле праціўніка, праяўленыя пры гэтым адвагу і гераізм, і за асобыя заслугі ў развіцці партызанскага руху 27 чалавек атрымалі высокае званне Героя Савецкага Саюза. Сярод іх — Бельскі, Корж, Машэраў, Шмыроў. На наступны дзень газета “Праўда” ў перадавым артыкуле “Гонар савецкім партызанам” пісала, што партызанская вайна падрыхтавала спрыяльныя ўмовы для наступлення Чырвонай Арміі на ўсёй тэрыторыі рэспублікі.

Загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксей Літвін выказаў свае пажаданні наконт ацэнкі ролі партызан у гады вайны. Ён

Источник: "Belarus" - №8, 2024-08-22



нагадаў, што ў навуковай і мастацкай літаратуры шырока выкарыстоўваюцца тэрміны "партызанскі фронт", "фронт у тыле ворага", "пяты фронт". Тут маецца на ўвазе партызанская і падпольная барацьба, масавая работа партыйных, камсамольскіх і антыфашысцкіх арганізацый, а таксама супраціўленне насельніцтва мерапрыемствам акупантаў. І ўсё гэта было складовай часткай савецкай стратэгіі вядзення вайны. "Важна разумець, што адбывалася на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Да пачатку аперацыі "Баграціён" праціўнік быў выбіты з 36 раёнаў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцей. З кастрычніка 1943-га па красавік 1944 года з часцямі Чырвонай Арміі злучыліся больш 35 партызанскіх брыгад і 15 асобна дзеючых партызанскіх атрадаў агульнай колькасцю больш 50 тысяч чалавек. Але на акупаванай тэрыторыі працягвала дзейнічаць вялікая армія беларускіх партызан. Пацвярджэннем гэтаму стала добра спланаваная, падрыхтаваная і цудоўна праведзеная стратэгічная наступальная аперацыя "Баграціён". У шчыльным узаемадзеянні з наступаючымі часцямі Чырвонай Арміі сваю зямлю вызваляў і беларускі народ у складзе пятага фронту, партызанскага", — заўважыў Аляксей Літвін. На яго думку, важна, каб гэта закладвалася ў свядомасць кожнага беларускага школьніка, каб на пытанне аб вызваленні Беларусі яны адказвалі, што яно было здзейснена сіламі не чатырох, а пяці франтоў. Магчыма, гэта трэба нейкім чынам прагаварываць і падчас экскурсій на Курган Славы, дзе стаіць помнік з чатырма штыкамі, якія сімвалізуюць чатыры франты, што вызвалялі Беларусь. А яшчэ ён упэўнены, што ў краіне павінен з'явіцца помнік, прысвечаны подзвігу беларускіх партызан.

У апошнія гады ў Беларусі праводзіцца шмат даследаванняў, звязаных з карнымі аперацыямі, якія захопнікі праводзілі на акупаванай тэрыторыі. Асабліва гэта тэма актуалізавалася, калі Генеральнай пракуратурай была распачата справа аб генацыдзе беларускага народа.

Аляксей Літвін звярнуў увагу, што аператыўная паўза, якая наступіла на беларускім кірунку напярэдадні аперацыі "Баграціён", калі Чырвоная Армія рыхтавалася да вырашальных баёў, для партызан стала часам барацьбы за выжыванне. Гітлераўскае кіраўніцтва імкнулася ўсімі сіламі не толькі ачысціць ад партызан прыфрантавую тэрыторыю, але і разграміць асноўныя партызанскія зоны і пастарацца ліквідаваць партызанскі рух. Сродкам для гэтага былі карныя аперацыі. Яны праводзіліся па ўсёй тэрыторыі Беларусі і працягваліся да 23 чэрвеня 1944 года. Для барацьбы супраць партызан акрамя спецыяльных сіл, якія вялі барацьбу і да гэтага, шырока сталі прыцягвацца злучэнні і часці Вермахта. У красавіку — чэрвені 1944 года карныя аперацыі па выцясненні партызан з прыфрантавой паласы праводзіліся на тэрыторыі паўночных раёнаў Мінскай, Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей. Калі ў студзені ў іх з нямецкага боку ўдзельнічала каля 30 тысяч чалавек, дык у сакавіку ўжо 60 тысяч, у красавіку — 80, у маі — да ста тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў, і да 23 чэрвеня — 60 тысяч. Самая буйная за гады вайны аперацыя "Фрюллінгсфест" прайшла з 11 красавіка па 9 мая 1944 года супраць партызан Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. У ёй былі задзейнічаны франтавыя дывізіі, ахоўныя войскі, войскі СС. Гэта каля 60 тысяч чалавек супраць 17 тысяч партызан. Гітлераўцам не ўдалося дасягнуць пастаўленых мэт. Па даных беларускага штаба партызанскага руху, ворагі страцілі ў гэтай аперацыі да 20 тысяч салдат і афіцэраў, 50 танкаў, 116 аўтамабіляў, 7 бронемашын, 22 гарматы і 2 самалёты.

Усяго са студзеня па 23 чэрвеня 1944 года было праведзена 30 буйных карных аперацый. Акрамя адбіцця іх, партызаны Беларусі вялі пастаянныя баявыя дзеянні супраць гарнізонаў праціўнікаў, дыверсіі на камунікацыях, прымалі ўдзел у пасяўной кампаніі, абароне партызанскіх зон. Адной з важнейшых задач партызан быў таксама збор разведвальнай інфармацыі для Чырвонай Арміі.

## Даследаванні працягваюцца

Бясспрэчна, у Беларусі зроблена шмат для перадачы ведаў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны наступным пакаленням. Як нагадаў акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Аляксандр Каваленя, пабудавана і захоўваецца 8,5 тысячы помнікаў і мемарыялаў, 180 курганоў памяці.

У нашай краіне створана ўнікальная хроніка «Памяць». У яе ўваходзяць 150 тамоў. Выдадзены ў Беларусі і адзіны на постсавецкай прасторы вучэбна-метадычны комплекс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны». За апошнія гады пабачылі свет такія выданні, як «Унёсак беларускага народа ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне», «Сузор'е герояў зямлі беларускай», «Твае сыны, Беларусь» і многія іншыя. Праводзіцца ўсенародная акцыя «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны. Успомнім усіх». Яна падтрымана выканаўчымі органамі ўлады, установамі адукацыі і культуры, грамадскімі арганізацыямі. Штогод, пачынаючы з 2020-га, выходзяць кнігі, у якіх падаюцца ўспаміны ўдзельнікаў, сямейныя хронікі, артыкулы, фатаграфіі, дакументы. Тут размяшчаецца інфармацыя пра франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў, якія змагаліся на тэрыторыі Беларусі. За чатыры гады, што дзейнічае акцыя, надрукаваны матэрыялы, прадстаўленыя вучонымі, выкладчыкамі, настаўнікамі, школьнікамі. Ужо размешчана 246 публікацый. Створаны чатыры кнігі, і збор інфармацыі працягваецца.

"Для таго, каб адказаць на пытанне, ці ўсё мы ведаем пра мінулую вайну, неабходна прааналізаваць, тое, што зроблена беларускімі гісторыкамі, якія пытанні



Яўген Кручкоў. Невычарпальная тэма

Источник: "Belarus" - №8, 2024-08-22



імі раскрытыя, а якія патрабуюць увагі”,— заўважыў Уладзімір Здановіч — прафесар кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, доктар гістарычных навук. Па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны абаронена больш 200 дысертацый, доктарскіх, кандыдацкіх, пабачылі свет больш дзясятка тысяч публікацый. Але, як паказвае кожная канферэнцыя, што праходзіць у нашай краіне з удзелам вучоных і даследчыкаў навучальных устаноў, пытанняў не памяншаецца. Адкрываюцца архівы, становяцца вядомымі новыя факты. Даследчык назваў найбольш важкія выданні за апошнія дзесяць гадоў і звярнуў увагу на тое, як пашыраецца база крыніц, якія ёсць новыя тэндэнцыі ў вывучэнні ваеннай гісторыі. Так актывізавалася дзейнасць па вывучэнні рэгіянальнай гісторыі. Напрыклад, брэсцкія архівісты падрыхтавалі зборнік дакументаў па акупацыі горада ў 1941–1944 гадах. Яшчэ адна асаблівасць апошніх гадоў — выданне зборнікаў дакументаў, падрыхтаваных Генеральнай пракуратурай.

У апошні час больш стала выходзіць зборнікаў, якія беларускія даследчыкі рыхтуюць разам з расійскімі калегамі. Напрыклад, дзякуючы такому супрацоўніцтву пабачыла свет серыя кніг “Без тэрміну даўнасці”, якія змяшчаюць інфармацыю пра злачынствы акупантаў у розных абласцях Беларусі. Значнай падзеяй стала выданне трохтомніка “Краіна ў агні”, дзе сабраны найноўшыя дасягненні гісторыкаў. Кожны з тамоў уключае дзве кнігі — у першай падаюцца нарысы, у другой — дакументы.

Павелічэнне базы крыніц дазволіла падрыхтаваць даследчыкам новыя працы. Сталі выходзіць новыя калектыўныя выданні, ініцыятарамі стварэння якіх выступіў Інстытут гісторыі НАН, а ў аўтарскім калектыве разам з вучонымі працуюць спецыялісты з навучальных устаноў.

Даследчыкі ўздымаюць новыя тэмы, імкнуцца знайсці іншыя падыходы да падачы інфармацыі. Яскравы прыклад таму — кніга Аляксея Літвіна “Хто можа, перадайце родным”. Яна прысвечана вязням гомельскай турмы, якія ў гады вайны пакідалі на сценах запісы пра сябе. З аднаго боку, у ёй пададзены дакументы, з другога, аўтар паказвае, як можна з імі працаваць, весці пошукі.

На новы ўзровень узнялося вывучэнне падзей 1941 года, якія раней не часта траплялі ў поле зроку даследчыкаў, асабліва ў савецкі перыяд, калі не прынята было гаварыць пра паражэнні і тое, як пачыналася вайна. Але гэта таксама быў час, калі воіны праяўлялі гераізм і мужнасць, нельга маўчаць і пра трагедыі, што былі ў пачатку вайны. Асобная тэма, якая пачала ўздымацца ў апошнія гады,— гісторыя паўсядзённасці. Даследчыкі загаварылі пра выжыванне звычайных безабаронных людзей, якія аказаліся на акупаванай тэрыторыі. Ваенную тэму пачалі разглядаць і ў курсе па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

## Дакументы сведчаць

Дырэктар дэпартамента па архівах і справаводству міністэрства юстыцыі Алег Воінаў расказаў аб рабоце дзяржархіваў па захаванні гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны і недапушчэнні яе фальсіфікацыі. Гэта адзін з важнейшых кірункаў дзейнасці ўстаноў.





Парад партызан у Мінску 16 ліпеня 1944 года

Вельмі запатрабаваныя выдавецкія праекты архівістаў аб генацыдзе беларускага народа “Без тэрміна даўнасці. Беларусь”, “Архівы. Нічога акрамя праўды”, “Карныя аперацыі нацыстаў на тэрыторыі Беларусі”.

Нацыянальны архіў Беларусі — адзіны архіў на постсавецкай прасторы, дзе сістэмна вывучаецца інфармацыя пра карныя аперацыі нацыстаў і іх пасобнікаў. Ужо пабачылі свет зборнікі дакументаў па карных аперацыях “Котбус”, “Кармаран”, “Зімняе чараўніцтва”. У гэтым годзе падрыхтаваны да друку зборнік пра карныя аперацыі супраць партызан Полацка-Лепельскай зоны. У зборнік уключана 560 дакументаў з беларускіх, расійскіх і амерыканскіх архіваў, большасць з якіх друкуецца ўпершыню. Выдавецкі праект складаецца з трох раздзелаў. Першы



Яўген Кручкоў. Невычарпальная тэма

Источник: "Belarus" - №8, 2024-08-22



асвятляе падрыхтоўку, ход і вынікі аперацый супраць партызан. Другі — паказанні сведкаў, карнікаў, якія ўдзельнічалі ў аперацыі, трэці расказвае пра злачынствы, здзейсненыя карнікамі, апытанні жыхароў.

Адзін з новых кірункаў даследаванняў, над якімі працуюць архівісты, датычыцца народных мсціўцаў — серыя "Партызанскі архіў". У 2025 годзе плануецца выдаць кнігу "Легендарныя баі і дыверсіі партызан". Ужо пабачылі свет навукова-папулярныя выданні "Дакументы па гісторыі партызанскага руху ў Беларусі" і "Мастацкая творчасць партызан". Такія кнігі невялікія па аб'ёме, добра ілюстраваныя. Яны дазваляюць даведацца пра раней малавядомыя аспекты партызанскай барацьбы. Серыя будзе працягвацца. Яна скіраваная на шырокую аўдыторыю і ў першую чаргу на маладое пакаленне.


Алена Дзядзюля

■ Падчас работы першай секцыі

Да юбілейнай даты — 80 годдзя вызвалення Беларусі — выдадзены фундаментальны праект "Аперацыя "Баграціён". Партызаны беларускай зямлі". Ён падрыхтаваны ў рамках праекта "Бібліятэка Саюзнай дзяржавы", кіраўніком якога з'яўляецца дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў. У кнізе расказваецца пра ўнёсак беларускіх партызан у паспяхова праведзеную аперацыю "Баграціён", расказваецца пра "рэйкавую" вайну, узаемадзеянне з часцямі Чырвонай Арміі. Пры падрыхтоўцы выкарыстоўваліся ўнікальныя матэрыялы беларускіх і расійскіх архіваў.

Як паведаміў Алег Воінаў, сёлета ад расійскіх і казахстанскіх калег беларускія архівісты атрымалі новыя дакументы, звязаныя з вызваленнем Беларусі.

Другі кірунак, які актыўна развіваюць архівы, — стварэнне дакументальных фільмаў. Валодаючы вялікімі рэсурсамі, што захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў на аснове кінахронікі ствараюцца дакументальныя фільмы. Сёння ў фондах архіва захоўваецца больш 60 тысяч адзінак кінадакументаў, а таксама больш 285 тысяч фатаграфій. "Наша мэта ў рабоце над фільмамі — утрымаць увагу гледача, стварыць эмацыянальную напругу і пры гэтым важна падтрымаць камфортнае ўспрыманне інфармацыі, — заўважыў Алег Воінаў, калі расказваў пра гэты новы від дзейнасці для архіваў. — Падрыхтоўка дакументальных фільмаў — складаны працэс, які тычыцца адбору і падачы дакументаў, размяшчэння фрагментаў, тэхнічнай апрацоўкі. Гэта звязана з неаднароднасцю дакументаў па якасці з'дымкі і агучвання, неабходна падабраць тыя матэрыялы, якія будуць максімальна спалучацца, ствараючы на экране эфект адзінага кадра".

Архівам створаны шэраг дакументальных фільмаў, сярод іх — "Аперацыя "Баграціён" і фільм "Вызваленне", дзе дэманструюцца ўсе этапы барацьбы. Такія праекты дазваляюць нагадаць у тым ліку і пра подзвігі, гераізм франтавых кінааператараў. Яны знаходзіліся на перадавой, побач з байцамі Чырвонай Арміі і партызанамі. Коштам кадра часам станавілася жыццё аператара. З 285 аператараў кожны трэці загінуў. Дарэчы, сёння ў архівах тэлевізіёншчыкі працуюць над фільмам пра аператараў і тых, хто вызваляў Беларусь.

У вызваленых гарадах і вёсках жыхарам прадстаяў новы подзвіг — рукамі народа была ўзнята з руін і аднаўлена гаспадарка, пабудаваны жылыя дамы, садкі, школы, заводы. І гэта таксама тэма для стварэння новых дакументальных фільмаў. Адзін з цікавых праектаў, над якім працуюць архівісты, — "Біяграфія маёй краіны", гэта відэаролікі па гісторыі.

Шмат робіцца для папулярызацыі дакументаў, інфармацыі, якую яны ўтрымліваюць. Гэта выстаўкі, тэматычныя лекцыі, дэманстрацыя фільмаў і відыясюжэтаў, праект "Адкрыты архіў", кіналекторыі. Прагляд стужкі "Вызваленне" арганізаваны на прадпрыемствах і ва ўстановах краіны. Дакументальныя фільмы дэманструюцца ў кінатэатрах, установах адукацыі і культуры. Работа па папулярызацыі дакументаў вядзецца ў рамках рэспубліканскай акцыі "Архівы — школе": з 2022 года праведзена звыш дзвюх тысяч мерапрыемстваў, у якіх узялі ўдзел больш 35 тысяч школьнікаў. Асноўная мэта гэтай работы — папулярызацыя нашай гісторыі, выхаванне патрыятызму.

Яўген **Кручкоў**



Яўген Кручкоў. Невычарпальная тэма